***УДК 37.018.43-057.874***
***Л. П. Кузьміч, Я. П. Грачышкіна***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ДЫСТАНЦЫЙНАЕ НАВУЧАННЕ ШКОЛЬНІКАЎ НА АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ

*Адкрываю, як свет нанова*
*беларускае роднае слова,*
*пераліўістае – як каменьчык,*
*вясёлкавае – як ручэй,*
*цёплае – як агеньчык*
*добрых тваіх вачэй,*
*светлае – як маланка,*
*гнеўнае – як пярун,*
*ціхае – як калыханка,*
*вечнае – як Беларусь!*

Ала Канапелька

Дыстанцыйнае навучанне займае своеасаблівую нішу на школьнай адукацыйнай прасторы. Такі спосаб атрымання дадатковых ведаў становіцца ўсё больш распаўсюджаным. У публікацыі мы раскажам пра некаторы вопыт правядзення заняткаў па беларускай мове і літаратуры на базе «Профі-курсаў» УА ГДУ імя Францыска Скарыны. Трэба адзначыць, што заняткі адбываюцца ўжо некалькі гадоў. Іх мэта заключаецца ў тым, каб пашырыць узровень ведаў вучняў розных узроставых груп, дапамагчы падрыхтавацца да алімпіяд, конкурсаў, пазнаёміць з алімпіяднымі заданнямі прошлых гадоў. Заняткі носяць інтэграваны характар і не паўтараюць школьную праграму. На ўступных занятках правяраецца агульная падрыхтоўка па беларускай славеснасці. Гэта могуць быць напісанне дыктоўкі, а таксама гутарка з вучнямі ў выглядзе пытанняў і адказаў па школьнай праграме. Усе заняткі суправаджаюцца арфаграфічнымі, арфаэпічнымі, інтэлектуальнымі хвілінкамі.

Яны пачынаюцца з праверкі дамашняга задання і з пытанняў да выкладчыка. Пры разглядзе тэмы «Фанетычная сістэма беларускай мовы» школьнікам варта запісаць некаторыя скарагаворкі, якія дазволяць дзецям патрэніравацца дома і звярнуць увагу на асаблівасці вымаўлення некаторых гукаў (***ч,р***) :

*Скача чапля па балоце,*
*Чачотачка ў чароце.*
*А чубаты чачот топча, топча агарод.*

*Я чачота падпільную,*
*Чапялою пачастую.*

Не абыходзяцца нашы заняткі без загадак, якія фарміруюць уяўленне аб навакольным асяроддзі на ўзроўні творчай фантазіі: *хоць у шапцы, а галавы не мае* (грыб); *у ваду садзіцца, а мокрае не бывае* (сонца); *прыйшоў на дзень, а пайшоў праз год* (новы год).

За кожным разам правяраецца дамашняя работа. Яна дазваляе пашырыць слоўнікавы запас, пазнаёміцца з устойлівымі выразамі. Фразеалагізмы вучні выпісваюць самастойна са слоўнікаў-даведнікаў, выбіраючы іх з артыкулаў пра тое ці іншае самабытнае слова роднай мовы. Такія найменні з’яўляюцца вызначальнымі і трапна характарызуюць нашу мову: *дзень, ноч, сонца, год, дождж, возера, рака, поле, лес, лён, канюшына, жыта*. Напрыклад, возьмем слова *балота*. Да яго варта падабраць сінонімы:

*алёс, багна, дрыгва, імшарына, тва*нь. Узгадаем назвы вядомых беларускіх балот: Ельня, Альманскія балоты, Спорава, Чортава Ковіна. Памятаем, што балоты называюць лёгкімі Еўропы. Распавядаем пра аповесць Народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа “Дрыгва”. Свой твор класік нашай літаратуры прысвяціў славутаму дзеду Талашу, помнік якому стаіць на высокім беразе Прыпяці ў палескім горадзе Петрыкаве. Школьнікам цікава даведацца пра значэнні слова, у чым нам дапамагае тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Сярод заданняў важнае месца займае пераклад слоў з рускай мовы на беларускую: *пряник – пернік, ладонь – далонь, подорожник – трыпутнік, мрамор – мармур, стержень – стрыжань, трезвый — цвярозы* і інш. Пераклад іх заключаецца ў перастаноўцы ў слове суседніх літар. Такая з’ява атрымала назву метатэза (перастаноўка). Цікавінкамі варта лічыць перыфразу, якая ўдала паказвае розныя праявы побыту, прыроды, культуры. Тапанімічныя найменні – галоўны нацыянальны набытак. Колькі ў іх змесце сабрана шчодрага досведу нашага народа: Рудня, Буда, Гута, Тартак, Пагост і інш. Напрыклад, для дзяцей з Чачэрска прапануем даведацца пра вёску Бердыж – стаянку першабытнага чалавека. Дарэчы, у гэтай вёсцы нарадзіўся вядомы паэт Леанід Гаўрылаў, які загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Выключная роля пад час правядзення заняткаў належыць педагогу, яго ўменню прыгожа, правільна і выразна размаўляць, дакладна фармуляваць заданні і падагульняць пройдзены матэрыял. Нам здаецца, што няпоўны пералік некаторых тэм і заданняў да заняткаў можа быць карысным не толькі для настаўнікаў, але і для тых, хто імкнецца авалодаць родным словам, зрабіць яго паслухмяным.

***УДК 37.017.4-057.875:070:378.4(476.2)***
***А. М. Куксо, О. Г. Ященко***
*г. Гомель, ГГУ имени Ф. Скорины*

## РОЛЬ ГАЗЕТЫ “ГОМЕЛЬСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ” В ВОЕННО-ПАТРИОТИЧЕСКОМ ВОСПИТАНИИ СТУДЕНТОВ

В комплексе мероприятий, направленных на военно-патриотическое воспитание студентов Гомельского государственного университета имени Франциска Скорины, важное место занимает формирование мировоззрения молодежи посредством публикации социально значимых материалов на страницах газеты “Гомельскі ўніверсітэт”. Несмотря на активный интерес новых поколений к ознакомлению с новостями и тематическими подборками различных электронных ресурсов, публикации в периодической печати остаются действенным инструментарием воздействия на жизненные ценности учащихся.

Газета “Гомельскі ўніверсітэт” выходит с 1969 года, момента преобразования Гомельского государственного педагогического института имени Валерия Чкалова в Гомельский государственный университет. На протяжении многих десятилетий здесь размещались статьи и заметки, документальные фото, освещавшие участие студентов и профессорско-преподавательского коллектива в праздновании памятных дат, отражающих военное прошлое Беларуси; рассказывавшие об оказании помощи ветеранам Великой Отечественной войны; популяризировавшие подвиг старших поколений. Подобные публикации были важны в советский период, не утратили своей актуальности на рубеже XXI века и сегодня.

Обратимся к рассмотрению вклада газеты “Гомельскі ўніверсітэт” в военно-патриотическое воспитание студентов на современном этапе. Среди изученных публикаций последних лет – лаконичные новостные сообщения, развернутые статьи о событиях в университетском сообществе и городском пространстве, белорусском государствев целом. Следует отметить компетентные подходы редакции газеты, которую в настоящий момент возглавляет Н. Лопатина, в расстановке акцентов на самые значимые факты, свидетельствующие о героическом прошлом белорусского народа и вызывающие чувство гордости, и мотивирующие молодых людей к осознанию необходимости защиты своего